# Праграмы ўступных выпрабаванняў па спецыяльнасцях для паступаючых ва ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі сферы культуры Рэспублікі Беларусь*

## Праграма ўступнага выпрабавання па мастацкіх спецыяльнасцях

### I. Агульныя палажэнні, парадак прыёму, арганізацыя і правядзенне ўступнага выпрабавання

Установы адукацыі сферы культуры (далей – установы адукацыі) ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па наступных мастацкіх спецыяльнасцях:

| *Шыфр* | *Спецыяльнасць, напрамак спецыяльнасці, спецыялізацыя* | *Кваліфікацыя* |
|---|---|---|
| **15 01 МАСТАЦТВА ВЫЯЎЛЕНЧАЕ** | | |
| **2-15 01 01** | **Жывапіс (па напрамках)** | *Мастак. Настаўнік.* |
| ***2-15 01 01-01*** | ***Жывапіс (станковы)*** | |
| **2-15 01 03** | **Скульптура** | *Мастак. Настаўнік.* |
| **15 02 МАСТАЦТВА ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ** | | |
| **2-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва** | | *Мастак. Настаўнік.* |
| ***2-15 02 01 01*** | ***Мастацкая кераміка*** | |
| ***2-15 02 01 03*** | ***Мастацкая апрацоўка дрэва*** | |
| ***2-15 02 01 31*** | ***Мастацкія вырабы з тэкстылю*** | |
| ***2-15 02 01 33*** | ***Мастацкія вырабы з саломкі, льну, паперы*** | |
| **19 01 ДЫЗАЙН** | | |
| **2-19 01 01** | **Дызайн (па напрамках)** | *Дызайнер-выканаўца. Настаўнік.* |
| ***2-19 01 01-01*** | ***Дызайн (аб'ёмны)*** | |
| ***2-19 01 01-01 01*** | ***Дызайн сродкаў вытворчасці і транспарту*** | |
| ***2-19 01 01-01 02*** | ***Дызайн вырабаў бытавога спажывання*** | |
| ***2-19 01 01-03*** | ***Дызайн (графічны)*** | |
| ***2-19 01 01-03 01*** | ***Тыпаграфіка*** | |
| ***2-19 01 01-03 31*** | ***Дызайн тары і ўпакоўкі*** | |

*Праграмы ўступных выпрабаванняў і крытэрыі адзнакі да іх могуць распрацоўвацца ўстановамі адукацыі ў суадносінах са спецыфікай дзейнасці на падставе Праграм ўступных выпрабаванняў па спецыяльнасцях для паступаючых ва ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі сферы культуры Рэспублікі Беларусь і зацвярджацца дырэктарам.

Уступнае выпрабаванне па мастацкіх спецыяльнасцях складаецца з трох этапаў, якія дыферэнцыруюцца ў залежнасці ад абранай спецыяльнасці, і праводзіцца ў адпаведнасці з пералічанымі ніжэй патрабаваннямі да кожнага іх.

Для выканання заданняў на ўступных выпрабаваннях па мастацкіх дысцыплінах абітурыент павінен мець пры сабе ўсе неабходныя матэрыялы (папера, кардон, палатно, фарбы, пэндзлі, алоўкі, гумкі, палітру, стэкі для лепкі, пластылін і г. д.). Выкананыя работы па спецыяльнасці не вяртаюцца.

Кожны з этапаў уступнага выпрабавання па спецыяльнасці ацэньваецца асобна. Адзнакі "0", "1", "2" па адным з этапаў з'яўляюцца недапушчальнымі для далейшага конкурснага ўдзелу.

Тэрмін выканання і колькасць гадзін, адведзеныя на асобныя этапы ўступнага выпрабавання па спецыяльнасці, можа змяняцца ў залежнасці ад спецыфікі дзейнасці ўстановы адукацыі і дзеючых правіл прыёму для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

## II. Змест уступнага выпрабавання

### *МАЛЮНАК*

**2-15 01 01 Жывапіс (па напрамках); 2-15 01 03 Скульптура; 2-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва; 2-19 01 01 Дызайн (па напрамках)**

Нацюрморт з 2–3 прадметаў простых па форме, лакальных па афарбоўцы, разнастайных па танальнасці і велічыні на фоне драпіроўкі (адным з прадметаў нацюрморта можа быць просты гіпсавы арнамент невысокага рэльефу).
Асвятленне: дзённае.
Матэрыял: аловак, папера.
Памер работы: не больш за фармат А2.
Тэрмін выканання: 8–12 акадэмічных гадзін (2–3 дні).

Патрабаванні: абітурыенты павінны скампанаваць на аркушы паперы відарыс нацюрморта, дакладна перадаць узаемнае размяшчэнне прадметаў, іх прапорцыі, характар і форму ва ўмовах зададзенага асвятлення, выканаць танальны малюнак з перадачай прасторы і матэрыяльнасці.

### *ЖЫВАПІС*

**2-15 01 01 Жывапіс (па напрамках); 2-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*; 2-19 01 01 Дызайн (па напрамках)**

Нацюрморт з 3–4 прадметаў побыту нескладанай формы, лакальных па колеры, разнастайных па матэрыяле, на фоне аднакаляровай драпіроўкі.
Асвятленне: дзённае.
Матэрыял: акварэль, гуаш, папера ці кардон.
Памер работы: не больш за фармат А2.
Тэрмін выканання: 8 акадэмічных гадзін (2 дні па 4 гадзіны).

---

*Па спецыялізацыям ***“Мастацкая кераміка”***, ***“Мастацкая апрацоўка дрэва”*** этап уступнага выпрабавання “Жывапіс”, можа быць заменены на этап “Скульптура”.

Патрабаванні: абітурыенты павінны дакладна адлюстраваць характар, форму, каляровыя і тонавыя суадносіны прадметаў у прасторы.

## *СКУЛЬПТУРА*

### 2-15 01 03 Скульптура

Копія барэльефнага арнаменту простай формы: разетка, лотас і г. д.
Памер работы: не больш за 50х50 см.
Матэрыял: гліна.
Тэрмін выканання: 8 акадэмічных гадзін (2 дні па 4 гадзіны).

Патрабаванні: абітурыенты павінны дакладна адлюстраваць прапорцыі, характар і форму барэльефу.

## *КАМПАЗІЦЫЯ*

### 2-15 01 01 Жывапіс (па напрамках)

Эскіз шматфігурнай сюжэтнай кампазіцыі на зададзеную тэму.
Матэрыял: на выбар абітурыента – акварэль, гуаш, папера ці кардон.
Памер работы: не больш за фармат А2.
Тэрмін выканання: 5 акадэмічных гадзін (1 дзень).

Патрабаванні: абітурыенты павінны праявіць здольнасць да вобразнага адлюстравання сваёй задумы на падставе назіральнасці і ўяўлення, умець кампазіцыйна арганізаваць плоскасць, правільна перадаваць прапарцыянальныя і прасторавыя суадносіны, граматна выкарыстоўваць колер і тон.

### 2-15 01 03 Скульптура

Эскіз кампазіцыі на зададзеную тэму – у круглай скульптуры.
Матэрыял: пластылін, гліна.
Памер работы: не больш за 30 см.
Тэрмін выканання: 5 акадэмічных гадзін (1 дзень).

Патрабаванні: абітурыенты павінны праявіць здольнасць да вобразнага адлюстравання сваёй задумы на падставе назіральнасці і ўяўлення, умець кампазіцыйна арганізаваць прастору, правільна перадаваць прапарцыянальныя і прасторавыя суадносіны.

### 2-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва

Эскіз кампазіцыі на аснове фармальнай кампазіцыі на зададзеную тэму (арнамент, фрыз, кампазіцыя ў квадраце, крузе і г. д.) з прапанаваных асобных, не звязаных паміж сабой прадметаў.
Матэрыял: на выбар абітурыента – акварэль, гуаш, папера, кардон і інш.
Памер работы: не больш за фармат А2.
Тэрмін выканання: 5 акадэмічных гадзін (1 дзень).

Патрабаванні: абітурыенты павінны прадэманстраваць здольнасць да вобразна-асацыятыўнага мыслення і стылізацыі, умець кампазіцыйна арганізаваць плоскасць, прадэманстраваць разуменне структурных прынцыпаў арнаментальна-дэкаратыўнай кампазіцыі, граматна выкарыстоўваць каляровыя і танальныя суадносіны.

**2-19 01 01 Дызайн (па напрамках)**

Эскіз на аснове фармальнай кампазіцыі на зададзеную тэму.
Матэрыял: на выбар абітурыента – акварэль, гуаш, папера, кардон і інш.
Памер работы: не больш за фармат А2.
Тэрмін выканання: 5 акадэмічных гадзін (1 дзень).

Патрабаванні: абітурыенты павінны праявіць здольнасць да вобразна-асацыятыўнага мыслення, пры ідэйнай распрацоўцы кампазіцыі, умець кампазіцыйна арганізаваць плоскасць (прастору), прадэманстраваць разуменне структурных прынцыпаў фармальнай кампазіцыі, граматна выкарыстоўваць каляровыя і танальныя суадносіны.

## Праграма ўступнага выпрабавання па музычных спецыяльнасцях

### I. Агульныя палажэнні, парадак прыёму, арганізацыя і правядзенне ўступнага выпрабавання

Установы адукацыі ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па наступных музычных спецыяльнасцях:

| *Шыфр* | *Спецыяльнасць, напрамак спецыяльнасці, спецыялізацыя* | *Кваліфікацыя* |
|---|---|---|
| **16 01 МАСТАЦТВА МУЗЫЧНАЕ** | | |
| **2-16 01 02 Дырыжыраванне (па напрамках)** | | |
| ***2-16 01 02-02*** | ***Дырыжыраванне (акадэмічны хор)*** | *Кіраўнік творчага калектыву. Артыст. Настаўнік.* |
| ***2-16 01 02-03*** | ***Дырыжыраванне (народны хор)*** | *Кіраўнік творчага калектыву. Артыст. Настаўнік.* |
| **2-16 01 10 Спевы (па напрамках)** | | |
| ***2-16 01 10-01*** | ***Спевы (акадэмічныя)*** | *Артыст хору, ансамбля. Кіраўнік вакальнай студыі.* |
| **2-16 01 31 Інструментальнае выканальніцтва (па напрамках)** | | |
| ***2-16 01 31-01*** | ***Інструментальнае выканальніцтва (фартэпіяна)*** | *Артыст аркестра, ансамбля. Канцэртмайстар. Настаўнік.* |
| ***2-16 01 31-02*** | ***Інструментальнае выканальніцтва (аркестравыя струнна-смычковыя інструменты (па відах інструментаў))*** | *Артыст. Кіраўнік творчага калектыву. Настаўнік.* |
| ***2-16 01 31-04*** | ***Інструментальнае выканальніцтва (аркестравыя духавыя і ўдарныя інструменты (па відах інструментаў))*** | *Артыст. Кіраўнік творчага калектыву. Настаўнік.* |
| ***2-16 01 31-05*** | ***Інструментальнае выканальніцтва (інструменты народнага аркестра (па відах інструментаў))*** | *Артыст. Кіраўнік творчага калектыву. Настаўнік.* |
| **21 04 КУЛЬТУРАЗНАЎЧЫЯ НАВУКІ** | | |
| **2-21 04 31** | **Музыказнаўства** | *Настаўнік.* |

Да пачатку ўступных выпрабаванняў прыёмная камісія ўстановы адукацыі праводзіць гутарку (праслухоўванне, прагляд) з кожным абітыруентам, каб вызначыць мэтазгоднасць яго ўдзелу ў конкурсе сярод паступаючых.

Уступнае выпрабаванне па спецыяльнасці праводзіцца па наступных этапах:

- выкананне праграмы (акрамя паступаючых на спецыяльнасць “Музыказнаўства”);
- сальфеджыо (пісьмова і вусна);
- музычная літаратура (для паступаючых на спецыяльнасць “Музыказнаўства”).

Кожны з этапаў уступнага выпрабавання па спецыяльнасці ацэньваецца асобна. Адзнакі "0", "1", "2" па адным з этапаў з'яўляюцца недапушчальнымі для далейшага конкурснага ўдзелу.

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Спевы (акадэмічныя)”**** праходзяць праверку музычна-слыхавых даных.

## II. Змест уступнага выпрабавання

## *ВЫКАНАННЕ ПРАГРАМЫ*

### 2-16 01 02 Дырыжыраванне (па напрамках)**

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Дырыжыраванне (акадэмічны хор)”*** павінны:

– праспяваць песню (акапэльна) і раманс (з асабістым суправаджэннем);
– прачытаць з ліста на фартэпіяна двухрадковую партытуру;
– прасальфеджыраваць з тактыраваннем харавыя партыі;
– прачытаць на памяць верш ці ўрывак з мастацкай прозы;
– прадэманстраваць узровень слыхавой культуры, музычнай памяці і рытму;
– выканаць на фартэпіяна эцюд, паліфанічны твор, п’есу.

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Дырыжыраванне (народны хор)”*** павінны:

– праспяваць не менш за дзве народныя песні (адна з іх на беларускай мове без суправаджэння);
– прачытаць на памяць верш ці ўрывак з мастацкай прозы;
– прадэманстраваць узровень слыхавой культуры, музычнай памяці і рытму;
– выканаць дзве п’есы на інструменце (на выбар абітурыента).

---

*Да ўступнага выпрабавання па напрамку спецыяльнасці ***«Спевы (акадэмічныя)»*** допускаюцца асобы, якім споўнілася 18 гадоў. На гэтую спецыяльнасць могуць прымацца асобы, якія не маюць музычнай падрыхтоўкі.

**Усе паступаючыя на спецыяльнасць **“Дырыжыраванне (па напрамках)”** да здачы ўступных выпрабаванняў праходзяць медыцынскі агляд урача-фаніятара.

## 2-16 01 10 Спевы (па напрамках)

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Спевы (акадэмічныя)”**** павінны мець неабходныя вакальныя і музычныя здольнасці, сфарміраваны здаровы галасавы апарат, музычны слых, пачуццё рытму, музычную памяць.

У абітурыентаў не павінна быць устойлівых дэфектаў мовы, а таксама фізічных недахопаў, якія будуць перашкаджаць прафесійнай працы.

Паступаючыя павінны:

– выканаць на памяць два творы беларускіх, рускіх, заходніх кампазітараў (песню, раманс, лёгкую арыю);
– выканаць на памяць верш, байку ці частку з мастацкай прозы;
– прадэманстраваць узровень слыхавой культуры, музычнай памяці і рытму.

## 2-16 01 31 Інструментальнае выканальніцтва (па напрамках)

### *2-16 01 31-01 Інструментальнае выканальніцтва (фартэпіяна)*

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Інструментальнае выканальніцтва (фартэпіяна)”*** павінны выканаць:

– поліфанічны твор трохгалоснага складу (у арыгінале);
– твор буйной формы;
– два эцюды на розныя віды тэхнікі;
– п’есу кантыленага характару.

### *2-16 01 31-02 Інструментальнае выканальніцтва (аркестравыя струнна-смычковыя інструменты (па відах інструментаў))*

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Інструментальнае выканальніцтва (аркестравыя струнна-смычковыя інструменты (скрыпка))”*** павінны выканаць:

– дзве трохактаўныя гамы (мажорную і мінорную) умераным рухам (4, 8, 12 і 24 гукі *legato*) і арпеджыо (3, 9 гукаў *legato*);
– мажорныя і мінорныя гамы ў тэрцыю, сексту і актаву ў межах першых трох пазіцый (1 і 2 інтэрвалы на адзін рух смычка) ва ўмераным руху;
– два эцюды на розныя віды тэхнікі;
– твор буйной формы;
– п’есу (пажадана віртуознага характару).

---

*Усе паступаючыя на спецыяльнасць па напрамку ***“Спевы (акадэмічныя)”*** да здачы ўступных выпрабаванняў праходзяць медыцынскі агляд урача-фаніятара.

Пастулаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Інструментальнае выканальніцтва (аркестравыя струнна-смычковыя інструменты (альт))”*** павінны выканаць:

– дзве трохактаўныя гамы (мажорную і мінорную) умераным рухам (4, 8, 12 і 24 гукі *legato*) і арпеджыо (3, 9 гукаў *legato*);
– мажорныя і мінорныя гамы ў тэрцыю, сексту і актаву ў межах першых трох пазіцый (1 і 2 інтэрвалы на адзін рух смычка) ва ўмераным руху;
– два эцюды на розныя віды тэхнікі;
– твор буйной формы;
– п’есу (пажадана віртуознага характару).

Пастулаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Інструментальнае выканальніцтва (аркестравыя струнна-смычковыя інструменты (віяланчэль))”*** павінны выканаць:

– дзве трохактаўныя гамы (мажорную і мінорную) умераным рухам (4, 8, 16 гукаў *legato*) і арпеджыо ўмераным рухам;
– мажорныя і мінорныя гамы ў тэрцыю, сексту і актаву (1 і 2 інтэрвалы на адзін рух смычка) умераным рухам;
– два эцюды на розныя віды тэхнікі;
– твор буйной формы;
– п’есу.

Пастулаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Інструментальнае выканальніцтва (аркестравыя струнна-смычковыя інструменты (кантрабас))”*** павінны выканаць:

– гаму;
– эцюд;
– дзве рознахарактарныя п’есы ці нескладаны твор буйной формы.

### *2-16 01 31-04 Інструментальнае выканальніцтва (аркестравыя духавыя і ўдарныя інструменты (па відах інструментаў))*

Пастулаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Інструментальнае выканальніцтва (аркестравыя духавыя і ўдарныя інструменты (флейта, габой, кларнет, фагот, саксафон, валторна, труба, трамбон, барытон, туба))”*** павінны выканаць:

– дзве гамы (мажорную і мінорную) да 4-х знакаў пры ключы *staccato* і *legato* ўмераным рухам, арпеджыо;
– эцюд;
– дзве п’есы (у тым ліку кантыленага характару) ці часткі цыклічнага твора.

Пастулаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Інструментальнае выканальніцтва (аркестравыя духавыя і ўдарныя інструменты (ударныя інструменты))”*** павінны выканаць:

*на ксілафоне:*

– дзве гамы (мажорную і мінорную) да 4-х знакаў пры ключы ўмераным рухам, арпеджыо;

– эцюд;
– дзве п’есы ці часткі цыклічнага твора;

*на малым барабане:*

– рытмічныя фігуры (“двойкі”, “тройкі”), рытмічныя камбінацыі;
– два эцюды.

### *2-16 01 31-05 Інструментальнае выканальніцтва (інструменты народнага аркестра (па відах інструментаў))*

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Інструментальнае выканальніцтва (інструменты народнага аркестра (гітара класічная, балалайка, домра, мандаліна, цымбалы))”*** павінны выканаць:

– дзве гамы (мажорную і мінорную) у дзве актавы і арпеджыо ўмераным рухам;
– эцюд;
– два рознахарактарныя творы (у тым ліку буйной формы).

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Інструментальнае выканальніцтва (інструменты народнага аркестра (баян, акардэон))”*** павінны выканаць:

– дзве гамы (мажорную і мінорную) у 3–4 актавы штрыхамі і штрыхавымі варыянтамі, арпеджыо;
– эцюд;
– поліфанічны твор;
– твор буйной формы;
– п’есу на інстуменце з выбарнай клавіятурай;
– п’есу віртуознага характару ці апрацоўку народнага твора.

## *САЛЬФЕДЖЫО*

Патрабаванні да ўступнага выпрабавання ўстанаўліваюцца ў суадносінах з тыпавымі вучэбнымі праграмамі па вучэбным прадмеце “Сальфеджыо” дзіцячых школ мастацтваў.

Паступаючыя па напрамках спецыяльнасці ***“Інструментальнае выканальніцтва (фартэпіяна)”, “Інструментальнае выканальніцтва (аркестравыя струнна-смычковыя інструменты (скрыпка, альт, віяланчэль))”, “Дырыжыраванне (акадэмічны хор)”*** павінны:

1. Напісаць аднагалосны дыктант на працягу 25 хвілін у аб’ёме 8 тактаў у мажорных ці мінорных танальнасцях з нескладаным рытмам і храматызмамі (памеры: 2/4, 3/4, 4/4; дыктуецца 10 разоў). Рытмічныя цяжкасці: сінкопы, трыёлі, ноты з кропкай, шаснаццатыя.
2. Праспяваць гаму да 4-х знакаў: мажорную (натуральную, гарманічную) і мінорную (натуральную, гарманічную і меладычную).
3. Праспяваць у танальнасці:

– ступені;

– інтэрвалы з вырашэннем (характэрныя, трытоны);
– акорды (трохгуччы галоўных ступеняў і іх launched перастварэнні, дамінантсептакорд і яго ператварэнні з вырашэннем, паменшаны септакорд VII ступені і малы септакорд VII з вырашэннем, септакорд II ступені).

4. Праспяваць ад гуку ўверх і ўніз асобныя інтэрвалы і акорды (указаныя ў п. 3); септакорды VII і II ступені – толькі ўверх; павялічанае і паменшанае трохгуччы – уверх і ўніз з вырашэннем.
5. Вызначыць на слых:

– інтэрвалы і акорды ад гуку (адпаведна п. 3);
– інтэрвалы і акорды ў танальнасці, асобна і ў паслядоўнасці (4–6 інтэрвалаў, 3–4 акорды).

6. Праспяваць з ліста незнаёмую мелодыю з тактыраваннем (дырыжыраваннем) у памерах 2/4, 3/4, 4/4 (меладычныя і рытмічныя цяжкасці – адпаведна дыктанту).

Паступаючыя па напрамках спецыяльнасці ***“Інструментальнае выканальніцтва (інструменты народнага аркестра (баян, акардэон, гітара класічная, балалайка, домра, мандаліна, цымбалы))”, “Дырыжыраванне (народны хор)”*** павінны:

1. Напісаць аднагалосны дыктант на працягу 25–30 хвілін у аб’ёме 8 тактаў, дыятанічны, у натуральным, гарманічным мажоры ці ў адным з відаў мінору; памеры: 2/4, 3/4, 4/4; дыктуецца 10 разоў. Рытмічныя цяжкасці: чвэрць з кропкай і восьмая, шаснаццатыя, пункцірны рытм, трыёль, сінкопы.
2. Праспяваць гаму: мажорную (натуральны від), мінорную (віды – натуральны, гарманічны, меладычны) да 4-х знакаў пры ключы.
3. Праспяваць у танальнасці:

– ступені;
– інтэрвалы з вырашэннем (дыятанічныя, характэрныя: павялічаная секунда, паменшаная септыма, павялічаная квінта, паменшаная кварта; трытоны паміж IV – VII ступенямі гарманічнага мінору);
– акорды (трохгуччы галоўных ступеняў і іх ператварэнні, дамінантсептакорд і яго ператварэнні з вырашэннем, павялічанае і паменшанае трохгуччы з вырашэннем).

4. Праспяваць ад гуку ўверх асобныя інтэрвалы і акорды, указаныя ў п. 3.
5. Вызначыць на слых:

– інтэрвалы, акорды ў танальнасці, асобна і ў паслядоўнасці (3–4 інтэрвалы, 3–4 акорды);
– інтэрвалы і акорды ад гуку (у адпаведнасці з п. 3).

6. Праспяваць незнаёмую мелодыю з ліста з тактыраваннем (дырыжыраваннем) у танальнасці да 2-х знакаў (меладычныя і рытмічныя цяжкасці – адпаведна дыктанту).

Паступаючыя па напрамках спецыяльнасці ***“Інструментальнае выканальніцтва (аркестравыя струнна-смычковыя інструменты (кантрабас))”***, ***“Інструментальнае выканальніцтва (аркестравыя духавыя і ўдарныя інструменты (флейта, габой, кларнет, фагот, валторна, труба, трамбон, туба, ударныя інструменты))”*** павінны:

1. Напісаць аднагалосны дыктант на працягу 30 хвілін у аб’ёме 8 тактаў, дыятанічны, у натуральным мажоры ці ў адным з відаў мінору; памеры 2/4, 3/4; дыктуецца 10 разоў. Рытмічныя цяжкасці: чвэрць з кропкай і восьмая, шаснаццатыя, пункцірны рытм.
2. Праспяваць гаму: мажорную (натуральны від), мінорную (віды – натуральны, гарманічны, меладычны) да 4-х знакаў у ключы.
3. Праспяваць у танальнасці:

– ступені;
– павялічаную секунду, паменшаную септыму, трытоны з вырашэннем;
– акорды (трохгуччы галоўных ступеняў і іх ператварэнні, дамінантсептакорд і яго ператварэнні з вырашэннем).

4. Праспяваць ад гуку ўверх асобныя інтэрвалы і акорды, указаныя ў п. 3.
5. Вызначыць на слых:

– інтэрвалы, акорды ад гуку (у адпаведнасці п. 3);
– інтэрвалы і акорды ў танальнасці, асобна і ў паслядоўнасці (3–4 інтэрвалы, 2–3 акорды).

6. Праспяваць з ліста незнаёмую мелодыю з тактыраваннем (дырыжыраваннем) у танальнасці да 2-х знакаў (меладычныя і рытмічныя цяжкасці – адпаведна дыктанту).

## 2-21 04 31 Музыказнаўства

Паступаючыя на спецыяльнасць ***“Музыказнаўства”*** здаюць уступнае выпрабаванне па двух этапах: сальфеджыо (пісьмовым і вусным) і музычнай літаратуры*.

Па **сальфеджыо** паступаючыя павінны:

1. Напісаць аднагалосны дыктант у аб’ёме 8–10 тактаў, які ўключае ў меладычны малюнак: скачкі, храматызмы, розныя рытмічныя складанасці (сінкопы, пункцірны рытм, трыёлі).
2. Праспяваць

*у танальнасці* (да 6-і знакаў пры ключы):

– гамы;
– простыя дыятанічныя інтэрвалы; трытоны, характэрныя інтэрвалы з вырашэннем;
– трохгуччы мажорныя і мінорныя, павялічанае і паменшанае трохгуччы з вырашэннем;

---

* Патрабаванні да ўступнага выпрабавання ўстанаўліваюцца ў суадносінах з тыпавымі вучэбнымі праграмамі па вучэбных прадметах “Сальфеджыо” і “Музычная літаратура” дзіцячых школ мастацтваў.

– дамінантсептакорд і яго ператварэнні; септакорды II ступені, уводны з вырашэннем;
– паслядоўнасці акордаў і інтэрвалаў з прасцейшымі адхіленнямі ў роднасныя танальнасці;

*ад гуку:*

– простыя інтэрвалы;
– трохгуччы мажорныя і мінорныя з ператварэннямі;
– дамінантсептакорд і яго ператварэнні; септакорды II ступені, уводны з вырашэннем;
– павялічанае і паменшанае трохгуччы – з вызначэннем танальнасці і вырашэннем.

3. Прачытаць з ліста аднагалосныя мелодыі з храматызмамі і мадуляцыямі ў роднасныя танальнасці.
4. Зрабіць пісьмова:

– слыхавы аналіз інтэрвалаў і акордаў, узятых ізалявана, а таксама ў паслядоўнасцях;
– прыклад на транспазіцыю;
– пабудову інтэрвалаў і акордаў ад зададзенага гуку і ў танальнасці;
– рытмічную групоўку;
– пабудову храматычнай гамы (мажорнай і мінорнай).

Час напісання 45 хвілін.

Па **музычнай літаратуры** паступаючыя павінны:

– напісаць музычную віктарыну (1–12 урыўкаў з пройдзеных твораў);
– расказаць аб творчым шляху кампазітара;
– зрабіць разбор музычнага твора.

Паступаючыя павінны паказаць сваю эрудыцыю ў галіне культуры і мастацтва, разбірацца ў асноўных гістарычных падзеях.

# Праграма ўступнага выпрабавання па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады»

## І. Агульныя палажэнні, парадак прыёму, арганізацыя і правядзенне ўступнага выпрабавання

Установы адукацыі ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады» па наступных напрамках:

| *Шыфр* | *Спецыяльнасць, напрамак спецыяльнасці, спецыялізацыя* | *Кваліфікацыя* |
|---|---|---|
| **17 03 МАСТАЦТВА ЭСТРАДНАЕ І ЦЫРКАВОЕ** | | |
| **2-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках)** | | |
| ***2-17 03 01-01*** | ***Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)*** | *Артыст. Кіраўнік эстраднага калектыву. Настаўнік.* |
| ***2-17 03 01-03*** | ***Мастацтва эстрады (спевы)*** | *Артыст. Кіраўнік эстраднага калектыву. Настаўнік.* |

Да пачатку ўступных выпрабаванняў прыёмная камісія ўстановы адукацыі праводзіць гутарку (праслухоўванне, прагляд) з кожным абітурыентам, каб вызначыць мэтазгоднасць яго ўдзелу ў конкурсе сярод паступаючых.

Уступнае выпрабаванне па спецыяльнасці праводзіцца па наступных этапах:

- выкананне праграмы;
- сальфеджыо (пісьмова і вусна).

Кожны з этапаў уступнага выпрабавання па спецыяльнасці ацэньваецца асобна. Адзнакі "0", "1", "2" па адным з этапаў з'яўляюцца недапушчальнымі для далейшага конкурснага ўдзелу.

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***"Мастацтва эстрады (спевы)"**** праходзяць праверку музычна-слыхавых даных.

---

*Па напрамку спецыяльнасці ***"Мастацтва эстрады (спевы)"*** могуць прымацца асобы, якія не маюць музычнай падрыхтоўкі.

## II. Змест уступнага выпрабавання

### *ВЫКАНАННЕ ПРАГРАМЫ*

### *2-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)*

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Мастацтва эстрады (інструментальная музыка (фартэпіяна))”*** павінны выканаць:
- два эцюды на розныя віды тэхнікі;
- поліфанічны твор трохгалоснага складу;
- дзве рознахарактарныя эстрадна-джазавыя п’есы;
- імправізацыю на зададзеную тэму.

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Мастацтва эстрады (інструментальная музыка (духавыя інструменты: саксафон, труба, трамбон))”*** павінны выканаць:
- дзве гамы (мажорную і мінорную) да 3-х знакаў пры ключы штрыхамі *staccato* і *legato* ўмераным рухам, арпеджыю;
- два эцюды на розныя віды тэхнікі;
- дзве рознахарактарныя п’есы (у тым ліку эстрадна-джазавага характару) ці частку цыклічнага твора.

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Мастацтва эстрады (інструментальная музыка (ударныя інструменты: ксілафон, вібрафон))”*** павінны выканаць:
- дзве гамы да 3-х знакаў пры ключы ўмераным рухам, арпеджыю;
- два эцюды;
- дзве рознахарактарныя п’есы (у тым ліку эстрадна-джазавага характару).

Выканаць на ўдарнай установцы:
- асноўныя тэхнічныя прыёмы (адзіночныя і двайныя ўдары, рытмічныя камбінацыі);
- поліртымічны эцюд (на сумесную работу рук і ног);
- 3–4 варыянты фактуры акампанементаў у эстрадна-танцавальнай і джазавай манеры;
- адзін твор пад фанаграму (–1).

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Мастацтва эстрады (інструментальная музыка (бас-гітара))”*** павінны рознымі спосабамі гуказдабывання (плектрам ці пальцамі) выканаць:
- дзве двухактаўныя гамы (мажорную і мінорную) да 3-х знакаў пры ключы ўмераным рухам, арпеджыю;
- два рознахарактарныя эцюды (тэхнічны і рытма-стылістычны);
- класічную п’есу ці частку цыклічнага твора;
- адну эстрадна-джазавую п’есу;
- імправізацыю на зададзеную тэму.

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Мастацтва эстрады (інструментальная музыка (гітара, электрагітара))”*** павінны рознымі спосабамі гуказдабывання (плектрам ці пальцамі) выканаць:

- дзве двухактаўныя гамы (мажорную і мінорную) да 3-х знакаў пры ключы ў 2–3-х варыянтах аплікатуры, арпеджыо ўмераным рухам;
- асобныя акорды (трохгуччы, акорды з дабаўленай секстай і нонай, дамінант-септакорд, паменшаны септакорд, септакорд II ступені) чвэрцямі ў 2–3-х палажэннях;
- класічную п’есу ці частку цыклічнага твора ў суправаджэнні фартэпіяна (плектрам);
- дзве эстрадна-джазавыя п’есы (адна з іх у акордавай фактуры).

### *2-17 03 01-03 Мастацтва эстрады (спевы)*

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці ***“Мастацтва эстрады (спевы)”**** павінны мець добрыя музычныя даныя: музычны слых, рытм, памяць, сфарміраваны, здаровы галасавы апарат, а таксама наяўнасць выканаўчых і артыстычных здольнасцей, валоданне пластыкай.

У паступаючых не павінна быць устойлівых дэфектаў мовы, а таксама фізічных недахопаў, якія будуць перашкаджаць прафесійнай працы.

Уступнае выпрабаванне праходзіць у два этапы.

1 этап:

- выкананне на памяць двух вакальных твораў абавязкова беларускага ці рускага і замежнага кампазітараў (адзін з іх без акампанементу);
- выкананне літаратурнага твора (верша, басні або ўрыўка з празаічнага твору);
- праверка музычнага слыху, музычнай памяці і рытму.

2 этап:

- выкананне на памяць двух твораў у эстрадна-джазавай манеры пад фанаграму або з канцэртмайстрам.

## *САЛЬФЕДЖЫО*

Паступаючыя па напрамках спецыяльнасці ***“Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)”*** павінны:

1. Напісаць аднагалосны дыктант на працягу 25 хвілін у аб’ёме 8 тактаў у мажорнай ці мінорнай танальнасці з складаным рытмам і хроматызмамі (памеры: 2/4, 3/4, 4/4; дыктуецца 10 разоў). Рытмічныя цяжкасці: сінкопы, трыёлі, ноты з кропкай, шаснаццатыя.
2. Праспяваць гаму да 4-х знакаў: мажорную (віды – натуральны, гарманічны) і мінорную (віды – натуральны, гарманічны і меладычны).

---

*Усе паступаючыя на спецыяльнасць па напрамку ***“Мастацтва эстрады (спевы)”*** да здачы ўступных выпрабаванняў праходзяць медыцынскі агляд урача-фаніятара.

3. Праспяваць у танальнасці:
- ступені;
- характэрныя інтэрвалы, трытоны – з вырашэннем;
- акорды (трохгуччы галоўных ступеняў і іх ператварэнні, дамінантсептакорд і яго ператварэнні з вырашэннем; септакорды VII ступені (паменшаны і малы), II ступені – з вырашэннем).
4. Праспяваць ад гуку ўверх і ўніз асобныя інтэрвалы і акорды, (указаныя ў п. 3); септакорды VII і II ступені – уверх; павялічанае і паменшанае трохгуччы – уверх і ўніз з вырашэннем.
5. Вызначыць на слых:
- інтэрвалы і акорды ад гуку (адпаведна з п. 3);
- інтэрвалы і акорды ў танальнасці, асобна і ў паслядоўнасці (4–6 інтэрвалаў, 3–4 акорды).
6. Праспяваць з ліста незнаёмую мелодыю з тактыраваннем (дырыжыраваннем) у памерах 2/4, 3/4, 4/4, 6/8 (меладычныя і рытмічныя цяжкасці – адпаведна дыктанту).

## Праграма ўступнага выпрабавання па спецыяльнасці «Народная творчасць»

### I. Агульныя палажэнні, парадак прыёму, арганізацыя і правядзенне ўступнага выпрабавання

Установы адукацыі ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасці «Народная творчасць» па наступных напрамках:

| *Шыфр* | *Спецыяльнасць, напрамак спецыяльнасці, спецыялізацыя* | *Кваліфікацыя* |
|---|---|---|
| **18 01 НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ** | | |
| **2-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)** | | |
| ***2-18 01 01-01*** | ***Народная творчасць (харавая музыка)*** | *Арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці. Кіраўнік харавога (фальклорнага) аматарскага калектыву.* |
| ***2-18 01 01-02*** | ***Народная творчасць (інструментальная музыка)*** | *Арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці. Кіраўнік інструментальнага (фальклорнага) аматарскага калектыву.* |
| ***2-18 01 01-31*** | ***Народная творчасць (народныя абрады і святы)*** | *Арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці. Рэжысёр народных абрадаў і святаў.* |
| ***2-18 01 01-32*** | ***Народная творчасць (танец)*** | *Арганізатар культурна-дасугавай дзейнасці. Кіраўнік аматарскага харэаграфічнага калектыву.* |

Да пачатку ўступных выпрабаванняў прыёмная камісія ўстановы адукацыі праводзіць гутарку (праслухоўванне, прагляд) з кожным абітурыентам, каб вызначыць мэтазгоднасць яго ўдзелу ў конкурсе сярод паступаючых.

### II. Змест уступнага выпрабавання

Пастулаючыя па напрамку спецыяльнасці *“Народная творчасць (харавая музыка)”** павінны:

– праспяваць не менш за дзве народныя песні;
– прачытаць на памяць верш ці ўрывак з мастацкай прозы;
– прадэманстраваць узровень слыхавой культуры, музычнай памяці і рытму;
– выканаць дзве п’есы на інструменце (на выбар абітурыента).

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці *“Народная творчасць (інструментальная музыка)”* павінны мець спецыяльныя музычныя здольнасці, звязаныя з уменнем іграць на адным з наступных музычных інструментаў: баян, акардэон, цымбалы, балалайка, домра, гітара, духавыя драўляныя і медныя інструменты. Паступаючыя павінны:

– выканаць на інструменце тры рознахарактарныя творы (нацыянальнай, замежнай, рускай, сучаснай музыкі, апрацоўкі народных песень);
– праспяваць песню пад уласны акампанемент;
– падабраць на інструменце акампанемент на прапанаваную мелодыю;
– прайсці праверку музычнага слыху, памяці і рытму.

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці *“Народная творчасць (народныя абрады і святы)”* павінны:

– прачытаць на памяць байку, верш, урывак з празаічнага твора;
– выканаць эцюды на зададзеную тэму;
– прайсці праверку музычна-слыхавых даных (праспяваць песню, паўтарыць некалькі нескладаных рытмічных малюнкаў, праспяваць меладычныя папеўкі, якія сыграны на музычным інструменце); пластыка-харэаграфічных даных (выканаць танец альбо некалькі танцавальных рухаў (без музыкі і з музыкай));
– паказаць веданне мясцовага фальклору (гульні, беларускія народныя песні, жарты, прымаўкі, прыказкі, святы і абрады), яго рэгіянальныя традыцыйныя асаблівасці;
– мець вопыт удзелу ў мастацкай самадзейнасці (фальклорным, тэатральным калектывах).

Паступаючыя па напрамку спецыяльнасці *“Народная творчасць (танец)”* павінны:

– прайсці праверку прафесіянальных і фізічных даных: (фактура, нацягнутасць пад’ёму, вываратнасць, гібкасць, скачок, крок, каардынацыя рухаў); музычна-слыхавых даных (слых, рытм, памяць);
– паказаць некалькі фрагментаў народнага танца;
– паўтарыць рухі;
– стварыць танцавальны эцюд на 32 такты па заданні.

## Праграма ўступнага выпрабавання

*Усе паступаючыя па напрамку спецыяльнасці *“Народная творчасць (харавая музыка)”* да здачы ўступных выпрабаванняў праходзяць медыцынскі агляд урача-фаніятара.

## па акцёрскіх спецыяльнасцях

## I. Агульныя палажэнні, парадак прыёму, арганізацыя і правядзенне ўступнага выпрабавання

Установы адукацыі ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па наступных акцёрскіх спецыяльнасцях:

| *Шыфр* | *Спецыяльнасць, напрамак спецыяльнасці, спецыялізацыя* | *Кваліфікацыя* |
|---|---|---|
| **17 01 МАСТАЦТВА ТЭАТРА, КІНО І ТЭЛЕБАЧАННЯ** | | |
| **2-17 01 01 Акцёрскае мастацтва (па напрамках)** | | |
| ***2-17 01 01-01*** | ***Акцёрскае мастацтва (драматычны тэатр і кіно)*** | *Акцёр. Кіраўнік творчага калектыву. Настаўнік.* |
| ***2-17 01 01-02*** | ***Акцёрскае мастацтва (тэатр лялек)*** | *Акцёр. Кіраўнік творчага калектыву. Настаўнік.* |

Да пачатку ўступных выпрабаванняў прыёмная камісія ўстановы адукацыі праводзіць гутарку (праслухоўванне, прагляд) з кожным абітыруентам, каб вызначыць мэтазгоднасць яго ўдзелу ў конкурсе сярод паступаючых.

## II. Змест уступнага выпрабавання

Паступаючыя па напрамках спецыяльнасці ***“Акцёрскае мастацтва”*** павінны:

– прачытаць на памяць байку, верш, урывак з прозы;
– выканаць эцюды на зададзеную тэму;
– прайсці праверку музычна-слыхавых даных (праспяваць песню, паўтарыць некалькі нескладаных рытмічных малюнкаў, праспяваць меладычныя папеўкі, якія сыграны на музычным інструменце); пластыка-харэаграфічных даных (выканаць некалькі прапанаваных танцавальных рухаў (без музыкі і з музыкай));
– паказаць іншыя здольнасці: ігра на музычным інструменце, або танцавальны нумар, або мастацка-афарміцельскія работы: лялькі, малюнкі, фотаздымкі, кампазіцыі.

## Праграма ўступнага выпрабавання

## па харэаграфічных спецыяльнасцях

## I. Агульныя палажэнні, парадак прыёму, арганізацыя і правядзенне ўступнага выпрабавання

Установы адукацыі ажыццяўляюць падрыхтоўку кадраў па наступных харэаграфічных спецыяльнасцях:

| *Шыфр* | *Спецыяльнасць, напрамак спецыяльнасці, спецыялізацыя* | *Кваліфікацыя* |
|---|---|---|
| **17 02 ХАРЭАГРАФІЧНАЕ МАСТАЦТВА** | | |
| **2-17 02 01 “Харэаграфічнае мастацтва” (па напрамках)*** | | |
| ***2-17 02 01-04*** | ***Харэаграфічнае мастацтва (народны танец)*** | *Артыст. Кіраўнік творчага калектыву. Настаўнік.* |
| ***2-17 02 01-05*** | ***Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец)*** | *Артыст. Кіраўнік творчага калектыву. Настаўнік.* |
| ***2-17 02 01-06*** | ***Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)*** | *Артыст. Кіраўнік творчага калектыву. Настаўнік.* |
| ***2-17 02 01-07*** | ***Харэаграфічнае мастацтва (класічны танец)*** | *Артыст. Кіраўнік творчага калектыву. Настаўнік.* |

Да пачатку ўступных выпрабаванняў прыёмная камісія ўстановы адукацыі праводзіць гутарку (праслухоўванне, прагляд) з кожным абітурыентам, каб вызначыць мэтазгоднасць яго ўдзелу ў конкурсе сярод паступаючых.

Кожны з этапаў уступнага выпрабавання па спецыяльнасці ацэньваецца асобна. Адзнакі "0", "1", "2" па адным з этапаў з'яўляюцца недапушчальнымі для далейшага конкурснага ўдзелу.

## II. Змест уступнага выпрабавання

*Паступаючыя па напрамках спецыяльнасці ***“Харэаграфічнае мастацтва”*** павінны прайсці абавязковую медыцынскую праверку па спіску захворванняў, забараняючых навучанне па данай спецыяльнасці.

Паступаючыя па напрамках спецыяльнасці ***“Харэаграфічнае мастацтва (народны танец)”***, ***“Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец)”***, ***“Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)”***, ***“Харэаграфічнае мастацтва (класічны танец)”*** здаюць уступнае выпрабаванне па двух этапах.

1 этап. Праверка фізічных, вонкавых сцэнічных і музычных даных:

– суадносіны росту і вагі;

– асаблівасці пабудовы цела, прапарцыянальнасць (астэнічны, атлетычны, брахіморфны, даліхаморфны тыпы пабудовы цела);

– спецыфічныя анатамічныя даныя і прафесійныя даныя (пабудова стапы, бядра, нацягнутая форма нагі, вываратнасць, скачок, танцавальны крок, рухавасць і сіла стапы, гнуткасць);

– прывабнасць (прыгажосць), артыстычнасць, эмацыянальнасць, валоданне мімікай;

– пластычная выразнасць (успрыманне і выкананне палажэнняў, пазіцый і поз, каардынацыя);

– індывідуальныя здольнасці;

– харэаграфічная памяць (маторыка), каардынацыя;

– рух у розных рытмах, тэмпах, амплітудах;

– рытмічная памяць;

– музыкальна-выканаўчая дасканаласць.

2 этап. Паступаючыя павінны ў суадносінах з манерай выканання абранага напрамка спецыяльнасці:

– выканаць сола (або ў пары) эцюд, фрагмент, альбо танцавальны нумар;

– паўтарыць прапанаваныя заданні;

– стварыць самастойна танцавальны эцюд па заданні;

– паказаць элементы сілавой і тэхнічнай падрыхтоўкі.